Гісторыя баявой машыны і мемарыяла над Дняпром / падрыхт. М. Сямашка // Аршанская газета. – 2020. – 28 сак. – С. 4.

## ГІСТОРЫЯ БАЯВОЙ МАШЫНЫ І МЕМАРЫЯЛА НАД ДНЯПРОМ

**На высокім беразе Дняпра ў Оршы застыла знакамітая «Кацюша». Мемарыял «За нашу Савецкую Радзіму» адкрылі ў 1966 годзе.**

Гэта не адзіны помнік на Аршаншчыне, які нагадвае пра подзвіг ракетчыкаў батарэі пад камандаваннем капітана Івана Флёрава. Першы залп па чыгуначным вузле батарэя дала ў 15.15 14 ліпеня 1941 года ля вёскі Пішчалава пад Оршай.


Іван Флёраў з жонкай Валянцінай і сынам Юрыем. 1940 г.


Адкрыццё мемарыяла ў 1966 г.


БМ-13

**Уздрыгвала зямля, плавілася жалеза**

Першыя тыдні Вялікай Айчыннай вайны. Нямецка-фашысцкія захопнікі рухаліся наперад. Але савецкія войскі наносілі моцныя ўдары па гітлераўцах. Ваенныя спецыялісты працавалі над новай зброяй – рэактыўнымі ўстаноўкамі. Выпрабаваць грозную зброю даверылі эксперыментальнай батарэі пад камандаваннем капітана Івана Флёрава. 14 ліпеня 1941 года яна нанесла моцныя ўдары па нямецкіх войсках на станцыі Орша і пераправе цераз Аршыцу.

Выпрабаванні навялі жах на фашыстаў. Немцы рапартавалі начальству, што ў савецкіх войскаў з'явілася невядомая зброя. Гітлер загадаў захапіць і знішчыць савецкія ракетныя ўстаноўкі. «Кацюшы» рухаліся ў бок Масквы, залпы гучалі на Смаленшчыне.

Батарэя капітана Флёрава трапіла ў акружэнне і прайшла па тыле ворага больш за 200 кіламетраў. Апошні бой артылерысты прынялі 7 кастрычніка 1941 года каля вёскі Багатыр на Смаленшчыне. Загінула большая частка асабовага саставу батарэі, разам з імі аддаў жыццё за будучую Перамогу Іван Флёраў. Немцам «Кацюша» не дасталася – савецкія воіны падарвалі сакрэтную зброю.

**Як нарадзіўся мемарыял над Дняпром?**

Звернемся да старых падшывак «Аршанскай газеты». У 1996 годзе былы галоўны архітэктар горада Георгій Кірылавіч Гаранскі расказваў нашаму карэспандэнту пра «Кацюшу»: «Па архітэктурнаму праекту гэты помнік насіў іншую назву – «Мемарыяльны комплекс «За нашу Савецкую Радзіму», які ў народзе затым назвалі проста «Кацюшы». Так устаноўку называлі і самі артылерысты. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны з'явілася песня «Кацюша», якая стала народнай.

У 1966 годзе ўлады горада вырашылі ўзвесці мемарыял, падрыхтоўчую работу даручылі галоўнаму архітэктару. «Пасля даволі працяглых пошукаў у горадзе выбралі месца на высокім левым беразе Дняпра, літаральна ў некалькіх метрах ад пачатку вуліцы Магілёўскай, – успамінаў Георгій Гаранскі. – З такой прапановай згадзіліся кіраўнікі горада, група спецыялістаў «Мінскпраекта», у тым ліку архітэктары Юрый Градаў, Леанід Левін, скульптар Валянцін Занковіч, інжынер Валерый Левін».

Галоўны архітэктар і сталічныя спецыялісты прапанавалі эскізы будучага помніка. Спыніліся на адным з варыянтаў, яго адобрыла і ўпраўленне артылерыі пры Міністэрстве абароны СССР. «Пачаліся работы па ўзвядзенню помніка, – расказваў Георгій Кірылавіч. – Першымі на будаўнічую пляцоўку прыйшлі спецыялісты БУ-41 з будтрэста № 18, які ўзначальваў заслужаны будаўнік рэспублікі Раман Куляеў. Непасрэдна работамі кіраваў спачатку прараб Пётр Бабычоў, а потым Мікалай Шаколаў. Дапамагалі і калектывы буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў – заводаў жалезабетонных вырабаў, «Легмаш», «Чырвоны барацьбіт», ільнокамбіната і іншых».

Гэта была народная новабудоўля. Сотні аршанцаў працавалі на суботніках, арганізацыі і прадпрыемствы пералічвалі грошы на ўзвядзенне помніка.

Георгій Гаранскі падзяліўся цікавай дэталлю: «Першыя ўстаноўкі «Кацюш» былі змантіраваны на айчынных грузавых аўтамабілях. Адну з іх будаўнікі атрымалі з вайсковай часткі з-пад Барысава. На гэтай машыне і ўстаноўлена сапраўдная «Кацюша», якая была дастаўлена ў Оршу з Ленінградскага ваенна-гістарычнага музея. Што датычыцца імітацый астатніх «Кацюш», то яны выраблены з жалеза і бетону ўмельцамі прамысловых прадпрыемстваў горада».

Калі адкрывалі мемарыял, ля баявой машыны паставілі калонкі. Яны разрывалі паветра жудасным ровам – і гэта нагадала аршанцам пра страшэнную вайну. Жыхары горада папрасілі зняць гукавое суправаджэнне.

**Праз 25 гадоў з першага залпа**

...на беразе Дняпра сабралася мора людзей. Ветэраны вайны і працы помняць, як гарэла зямля і якой крывёй далася Перамога. Не ўсе змаглі прыйсці на адкрыццё мемарыяла ракетчыкам – шмат жыццяў забрала вайна.

На адкрыццё «Кацюш» у Оршу з усіх куткоў Савецкага Саюза прыехалі артылерысты эксперыментальнай батарэі, якім пашчасціла выжыць. Ракетчыкі сустрэліся ў Маскве і ад сцен Крамля пайшлі легендарным маршрутам 1941 года, калі ўпершыню выпрабавалі новую грозную зброю на мяжы Смаленскай і Віцебскай абласцей гасцей сустракалі хлебам-соллю. Ветэраны пабывалі ў раёнеПішчалава. А пазней удзельнічалі ва ўрачыстым мітынгу. Маршал Савецкага Саюза А. І. Яроменка ўспамінаў, як яму загадалі выпрабаваць новую зброю, якую называлі «эрэсай»: «Даў каманду капітану І. А. Флёран нанесці ўдар з новай зброі. Вынік перасягнуў усе надзеі. Як далажылі мне, на месцы ўзрыву ракет-снарадаў суцэльнае мора агню. Адгэтуль і пачала свой баявы шлях грозная рэактыўная зброя.

**Кацюша – у гонар «Кацюшы»**

У Івана Флёрава ёсць унучка Марына Смірнова. Сваю дачку Кацярыну – Кацюшу – яна назвала ў гонар знакамітых установак і подзвігу дзеда. Юрый, сын Івана Флёрава, – бацька Марыны. Доўгі час родныя не ведалі пра баявы пуць Івана Андрэевіча. Дакументы былі засакрэчаны.

У1963годзе Івана Флёрава пасмяротна узнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны першай ступені. У 1995 годзе камандзіру батарэі пасмяротна прысвоелі званне Героя Расійскай Федэрацыі. Яго сын не дажыў да гэтай падзеі два гады.

**Падрыхт. М. Сямашка**
**Фота аўтара,**
**з архіва «АГ» і музея**
**гісторыі і культуры**
**г. Оршы**